Гарбавіцкі вучэбна-педагагічны комплекс
дзіцячы сад – сярэдняя школа

# Love in works by W.Shakespeare and R.Borodulin

*by example Sonnet 116 and a poem "Што ёсць каханне?"*

# Тэма кахання ў творчасці У.Шэкспіра і Р.Барадуліна

*на прыкладзе санета 116 і верша "Што ёсць каханне?"*

Інтэграваны ўрок у 11 класе

**С. Г. Ежалева,**
настаўнік англійскай мовы
другой катэгорыі

**С. М. Зяцькова,**
настаўнік беларускай літаратуры
першай катэгорыі

**Інтэграваны ўрок** – гэта спецыяльна арганізаваны ўрок, мэта якога можа быць дасягнута толькі пры аб'яднанні ведаў з розных прадметаў. Урок накіраваны на разгляд і вырашэнне якой-небудзь праблемы, якая дазваляе дасягнуць поўнага ўспрымання навучэнцамі пастаўленага пытання; ён спалучае ў сабе розныя метады і мае практычную накіраванасць. У гэтай сувязі інтэграваныя ўрокі дапамагаюць дзецям аб'яднаць атрыманыя веды ў адну сістэму і актывізаваць цікавасць навучэнцаў да прадметаў.

Прапануецца інтэграваны ўрок англійская мова+беларуская літаратура. Прыярытэтам яго з'яўляецца развіццё эмацыянальна-каштоўнаснага свету асобы.

Пры стварэнні гэтага ўрока ўлічвалася тое, што тэма кахання актуальна для вучняў дадзенага ўзросту, а таксама што яны ўмеюць аперыраваць паняццямі, аналізаваць праблемы, параноўваць, абагульняць інфармацыю і на гэтай падставе рабіць высновы. Яны маюць як індывідуальны вопыт работы, так і вопыт работы ў групах.

**Тэма ўрока.** Love in works by W.Shakespeare and R.Borodulin (by example Sonnet 116 and a poem «Што ёсць каханне?»).

**Узровень прадстаўлення зместу вучэбнага матэрыялу:** базавы.

**Навучальная мэта ўрока.** Мяркуецца, што да заканчэння ўрока вучні будуць:

- валодаць біяграфічнымі звесткамі пра паэтаў;
- умець аналізаваць лірычныя творы на аснове асабістага ўспрымання і асэнсавання мастацкіх твораў, вызначаць тэму і ідэйны сэнс, паэтычныя асаблівасці вершаванных твораў;
- валодаць элементамі лінгва-стылістычнага аналізу паэтычных тэкстаў на прыкладзе дзвюх моў.

**Развіваючая мэта ўрока**:

- стварыць умовы для развіцця творчых здольнасцей вучняў праз дэкламацыю паэтычных твораў;
- садзейнічаць развіццю навыкаў маналагічнага і дыялагічнага маўлення, развіццю інтэлектуальных і творчых здольнасцей.

**Выхаваўчая мэта ўрока:**

- стварыць умовы для фарміравання павагі і цікавасці да нацыянальнай культуры беларускага народа і культуры англійскага народа;
- садзейнічаць выхаванню ўважлівых адносін да слова, развіццю мастацкага густу вучняў;
- садзейнічаць выхаванню індывідуальнай і калектыўнай культуры навучальнай дзейнасці (уменняў слухаць, уважліва адносіцца адзін да аднаго, працаваць у групе);
- арганізаваць сітуацыі для ўспрымання кахання як сапраўднага, прыгожага пачуцця.

**Задачы ўрока:**

- пазнаёміць вучняў з жыццём і творчасцю англійскага паэта У.Шэкспіра і беларускага паэта Р.Барадуліна;
- звярнуць увагу вучняў на праблемы і маральныя прынцыпы замежнага і нацыянальнага паэтаў, якія пісалі ў розныя стагоддзі;
- выхоўваць удумлівага чытача, зацікавіць інтымнай лірыкай У.Шэкспіра і Р.Барадуліна;
- фарміраваць навыкі самастойнага аналізу тэкста, уменне выказваць свае адносіны да прачытанага.

**Абсталяванне:** партрэты У.Шэкспіра і Р.Барадуліна, мультымедыйны праектар, камп’ютар, прэзентацыя, аўздыёзапісы твораў “Sonnet 116”, “Што такое каханне?”, дадатковы матэрыял на картках, тэксты вершаў і біяграфій.

**Заданне да ўрока:** дэкламацыя любімых вершаў пра каханне.

## *Ход урока*

### 1. *Арганізацыйны этап. Стварэнне псіхалагічнага настрою (3 хвіліны)*

**Мэта:** псіхалагічна падрыхтаваць клас да ўрока; арганізаваць увагу вучняў; накіраваць да свядомага засваення вучэбнага матэрыялу.

**Педагагічныя задачы**: стварыць ўмовы для актыўнага выкарыстання беларускай і англійскай моў у вусным маўленні; актывізаваць суб'ектны вопыт навучэнцаў, іх веды і ўменні; сфарміраваць пазнавальную цікавасць да матэрыялу.

| Дзейнасць настаўніка беларускай літаратуры | Дзейнасць настаўніка англійскай мовы | Дзейнасць вучняў | Прагназаваны вынік адукацыйнай дзейнасці |
|---|---|---|---|
| *Вітае вучняў, садзейнічае ўсведамленню імі асноўных паняццяў урока.*<br><br>Добрай раніцы, паважаныя сябры! Вельмі прыемна бачыць вас, такіх прыгожых і разумных!<br><br>Перш чым звярнуцца да тэмы нашага ўрока, мы хочам з вамі пагуляць ў незвычайную гульню.<br><br>***Гульня"Дэкларацыя самакаштоўнасцей"***<br>1. Я такі, як усе.<br>3. Я люблю сябе і сябрую з сабой.<br>5. Я магу адчуваць, думаць, гаварыць і дзейнічаць | *Вітае вучняў, садзейнічае ўсведамленню імі асноўных паняццяў урока.*<br><br>Good morning, my dear friends! I'm glad to see you!<br><br>If you agree with our words, get up and change places.<br>2. I'm not like others.<br>4. Sometimes I annoyed with myself.<br>6. I have a good mood today | Вітаюцца з настаўнікамі. Эмацыянальна настройваюцца на працу.<br><br>Слухаюць і мяняюцца месцамі, калі яны згодны з настаўнікамі. | Падрыхтаванасць класа да ўрока, стварэнне псіхалагічнага настрою на ўрок. |

### *1.1. Этап актуалізацыі ведаў і тэмавызначэння (3 хвіліны)*

| Дзейнасць настаўніка беларускай літаратуры | Дзейнасць настаўніка англійскай мовы | Дзейнасць вучняў | Прагназаваны вынік адукацыйнай дзейнасці |
|---|---|---|---|
| *Гучыць спакойная музыка. Настаўнікі чытаюць выказванні пра каханне, якія змешчаны на дошцы, і дапамагаюць вучням у вызначэнні тэмы ўрока.*<br>"Пачынаецца ўсё з яго.<br>А інакш і жыць немагчыма."<br>(Я. Янішчыц) | *Гучыць спакойная музыка. Настаўнікі чытаюць выказванні пра каханне, якія змешчаны на дошцы і дапамагаюць вучням у вызначэнні тэмы ўрока.*<br>Listen carefully, and then tell us: what is the topic of our | Уважліва слухаюць і адказваюць на пытанне настаўнікаў. | Вызначэнне тэмы заняткаў. |

| | | | |
|---|---|---|---|
| Гэта самая вялікая каштоўнасць. Гэта адзіная рэч, якую мы можам падарыць і яна ўсе ж такі ў цябе застанецца.” (Леў Талстой)<br><br>*Слухае варыянты адказаў вучняў.* | lesson?<br>«It always brings difficulties, that is true, but the good side of it is that it gives energy. » (Vincent Van Gogh)<br>«It is not to look at one another, but to look together in the same direction.» (Antoine de Saint-Exupéry)<br><br>*Слухае варыянты адказаў вучняў.* | | |

*1.2 <u>Мэтавызначэнне (2 хвіліны)</u>*

| Дзейнасць настаўніка беларускай літаратуры | Дзейнасць настаўніка англійскай мовы | Дзейнасць вучняў | Прагназаваны вынік адукацыйнай дзейнасці |
|---|---|---|---|
| *Аб'яўляюць тэму і задачы ўрока.*<br><br>Мы звернемся да тэмы кахання і разгледзім яе на прыкладзе творчасці двух паэтаў, прадстаўнікоў Беларусі і Англіі, Рыгора Барадуліна і Уільяма Шэкспіра.<br><br>Таксама мы пазнаёмімся з жыццёвым і творчым шляхам паэтаў, вызначым на прыкладзе двух твораў асаблівасці гучання вершаў пра каханне. | *Аб'яўляюць тэму і задачы ўрока.*<br>Today we have an unusual lesson. We've got a Belarusian-English lesson and we wish you to speak both Belarusian and English languages.<br><br>We'll compare two works of two poets from different cultures. And our aim is to find what these poems have in common. | Слухаюць настаўнікаў. | Вучні вызначаюць для сябе мэту сваёй працы на ўроку. |

## 2. <u>*Аперацыйна-пазнавальны этап (27 хвілін)*</u>

**Мэта**: па заканчэнні этапа вучні будуць дэманстраваць веды па тэме ўрока, уменні будаваць маналагічнае і дыялагічнае выказванні, навыкі вуснага маўлення на англійскай і беларускай мовах.

**Метадычная задача**: забяспечыць ўмовы для ліквідацыі лексічных цяжкасцей навучэнцаў, замацаваць навыкі аналізу вершаванных твораў, садзейнічаць фарміраванню навыкаў вуснага маўлення ва ўмовах двухмоўя, развіццю творчых здольнасцей вучняў.

| Дзейнасць настаўніка беларускай літаратуры | Дзейнасць настаўніка англійскай мовы | Дзейнасць вучняў | Прагназаваны вынік адукацыйнай дзейнасці |
|---|---|---|---|
| Зараз мы пазнаёмімся з біяграфіямі паэтаў. Але для | | | Вучні пазнаёмяцца з |

| | | | |
|---|---|---|---|
| гэтага нам трэба падзяліцца на групы. У кожнага з вас ёсць аркуш паперы з імёнамі паэтаў. Прачытайце іх і вызначце, якой краіны гэта паэт. *(Дадатак 1)* | If you have written the name of the Belarusian poet, take your seat at the table with the Belarusian flag. If you have the name of the English poet - take your seat at the table with the flag of the UK. | Займаюць адпаведнае месца. | біяграфіяй паэтаў, з вершамі Р.Барадуліна”Што такое каханне?” і 116 Санетам У.Шэкспіра, зробяць іх аналіз. Прадставяць свае творчыя праекты. |
| | We offer you the texts of the biographies of the poets. You will read, answer the questions and prepare an oral report. *(Дадатак 2)* | Пачынаюць знаёміцца з біяграфіямі паэтаў, адказваюць на пытанні пасля тэкстаў. | |
| У вас на працу 3-4 хвіліны. | | | |
| Калі ласка, раскажыце пра Рыгора Барадуліна. | Group of the UK, please tell us about William Shakespeare. | | |
| *Слухае варыянты адказаў вучняў.* | *Слухае варыянты адказаў вучняў.* | Робяць вуснае выказванне. | |
| | Now we offer you to listen two works by Borodulin and Shakespeare, then we will analyze them. | | |
| | *Уключае аўдёзапіс санета.* | | |
| | | Слухаюць аўдыёзапісы твораў. | |
| *Уключае аўдыёзапіс верша. (Дадатак 3)* | There is a plan on your desks. It will help you to do the analysis. *(Дадатак 4)* | | |
| Вы праслухалі вершы, а зараз давайце зробім іх аналіз. | | Знаёмяцца з планам аналізу вершаваных твораў. | |
| ***<u>Параўнальны аналіз вершаў.</u>*** | | | |
| Вычначце тэму верша. Пра што гэты верш?<br>Ідэя верша? | | | |
| Давайце крыху адпачнём і адначасова ўспомнім паэтычныя сродкі. | Let’s identify the topic of the sonnet. What is it about? | Аналізуюць па схеме прапанаваныя творы. | |
| **<u>ФІЗКУЛЬТХВІЛІНКА</u>** | *Слухае варыянты адказаў вучняў.* | | |
| На дошцы дадзены тэрміны, якія | | | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| будуць вам неабходны ў працэсе працы. *(Дадатак 5)*<br><br>*Сочыць за выкананнем задання.*<br><br>Знайдзіце, калі ласка, гэтыя паэтычныя сродкі ў вершы.<br><br>*Слухае варыянты адказаў вучняў.*<br><br>Якая інтанацыя верша, яго эмацыянальная афарбоўка?<br><br>*Слухае варыянты адказаў вучняў.*<br><br>У любой літаратуры ёсць шмат паэтаў, якія пісалі і пішуць пра каханне. *(Дадатак 6)*<br><br>*Чытае вершы.*<br><br>Да ўрока вы атрымалі заданне. Мы ведаем, што да яго вы аднесліся творча. Давайце паглядзім, што з гэтага атрымалася. | What is the main idea of the sonnet?<br>*Слухае варыянты адказаў вучняў.*<br><br>Match the Belarusian and English equivalents.<br><br>*Сочыць за выкананнем задання.*<br><br>Please, find specific methods which the poet uses to express the beauty of the language.<br><br>*Слухае варыянты адказаў вучняў.*<br><br>What is the tone of the sonnet, its emotional coloring?<br><br>*Слухае варыянты адказаў вучняў.*<br><br>W.Sh. wrote his sonnets and plays in the 16th century, and Borodulin created his poems in the 20th century. What does unite the poets?<br><br>*Слухае варыянты адказаў вучняў.*<br><br>Your knowledge in literature is very good and we've prepared for you an interesting task. You are to listen the verses and guess the authors. *(Дадатак 6)*<br><br>*Чытае вершы.*<br>Now we want to listen how can you recite your favourite Belarusian and English poems about love. | Супастаўляюць эквіваленты.<br><br>Робяць аналіз вершаў.<br><br>Выказваюць свае думкі па прапанаваным пытанні.<br><br>Слухаюць урыўкі з вершаў, імкнуцца пазнаць аўтара.<br>Прадстаўляюць свае творчыя праекты. | |

### 3. ***Ацэначны этап (3 хвіліны)***

**Мэта**: па заканчэнні этапа вучні ажыццяўляюць самакантроль, звязаны з вучэбным матэрыялам.

**Метадычная задача:** арганізаваць самакантроль засвоеных прадметных ведаў і ўменняў па тэме.

| Дзейнасць настаўніка беларускай літаратуры | Дзейнасць настаўніка англійскай мовы | Дзейнасць вучняў | Прагназаваны вынік адукацыйнай дзейнасці |
|---|---|---|---|
| *Дае ацэнку дзейнасці на ўроку кожнага вучня.*<br>*Прапаноўвае вучням ацаніць сваю працу на ўроку і самім выставіць сабе адзнакі.*<br><br>Мне вельмі спадабалася ваша праца на ўроку. Мне было прыемна чуць вашы добрыя адказы.<br>Выстаўце, калі ласка, самі сабе адзнакі.<br>*Слухае адказы вучняў.* | *Дае ацэнку дзейнасці на ўроку кожнага вучня.*<br>*Прапаноўвае вучням ацаніць сваю працу на ўроку і самім выставіць сабе адзнакі.*<br><br>Today I think all of you have been active and creative and have shown good knowledge of the theme of the lesson.<br><br>*Слухае адказы вучняў.* | Ацэньваюць сваю працу на ўроку, выстаўляюць сабе адзнаку, робяць іх каментарый. | Вучні самастойна прааналізуюць і ацэняць сваю дзейнасць на ўроку. |

### 4. ***Этап рэфлексіі (5 хвілін)***

**Мэта:** па заканчэнні этапа вучні робяць аналіз урока, звяртаючыся да яго тэмы.

**Метадычная задача:** забяспечыць самааналіз засвоеных прадметных ведаў і ўменняў па тэме, садзейнічаць развіццю здольнасцей да рэфлексіі сваёй дзейнасці, фармуліроўкі вынікаў.

| Дзейнасць настаўніка беларускай літаратуры | Дзейнасць настаўніка англійскай мовы | Дзейнасць вучняў | Прагназаваны вынік адукацыйнай дзейнасці |
|---|---|---|---|
| Каханне – чароўны і непаўторны свет. Яно найвялікшае свята, яно радасць, пакуты і шчасце. Кожны чалавек чакае гэтага пачуцця. | Love is a great feeling. It makes people happier and our life becomes brighter. | | Вучнямі прааналізаваны індывідуальныя вынікі дзейнасці. |

| | | | |
|---|---|---|---|
| Яно абавязкова прыходзіць да кожнага. | | | |
| *Слухае варыянты адказаў вучняў.* | It’s interesting for me to know what new things you have learnt today. Tell me please what you liked most of all.<br>*Слухае варыянты адказаў вучняў.* | Ацэньваюць дасягнутыя вынікі, эфектыўнасць сваёй працы на ўроку.<br>Выказваюць свае адносіны. | |
| Дайце адказ на пытанне:<br>“Што такое каханне ў вашым разуменні?” і напішыце на сэрцы свой адказ. | “What is love for you?”<br>Read what you think about it and put your paper heart on the blackboard. *(Дадатак 7)* | Запісваюць свае думкі на сэрцах, зачытваюць іх і вешаюць сэрцы на дошку. | |
| *Слухае варыянты адказаў вучняў.*<br>“А ці можа чалавек жыць без кахання?” | *Слухае варыянты адказаў вучняў.* | | |
| *Слухае варыянты адказаў вучняў.* | «Can people live without love?»<br>*Слухае варыянты адказаў вучняў.* | Адказваюць на пытанне. Выказваюць свае меркаванні. | |

***5. Этап вызначэння і фармуліроўкі дамашняга задання (2 хвіліны)***

**Мэта:** па заканчэнні этапа вучні робяць самастойны выбар у змесце дамашняга задання.

**Метадычная задача:** стварыць ўмовы для самавызначэння вучняў ў выкананні дамашняга задання.

| Дзейнасць настаўніка беларускай літаратуры | Дзейнасць настаўніка англійскай мовы | Дзейнасць вучняў | Прагназаваны вынік адукацыйнай дзейнасці |
|---|---|---|---|
| *Прапаноўвае вучням заданне.*<br>Ваша дамашняе заданне: знайсці іншыя вершы пра каханне Р.Барадуліна, вывучыць адзін з іх на памяць, падрыхтаваць яго аналіз па схеме або напісаць водгук на гэты верш. | *Прапаноўвае вучням заданне.*<br>You hometask is to find one of sonnets by W.Sh about love and translate it into Belarusian language.<br>Thank you for the lesson. Goodbye! | Самавызначаюцца ў выбары дамашняга задання, запісваюць яго ў дзённікі. | Самастойны выбар дамашняга задання. |

Дадатак 1

Yanka Kupala

Eugeny Yanishchits

Pimen Panchanka

Vladimir Karatkevich

Joseph Kipling

Oscar Wilde

Lord Byron

William Wordsworth

Дадатак 2

**The Biography of William Shakespeare**

Great Britain has given lots of prominent people to the world, but one of the noblest and most famous man of all was William Shakespeare. He was a famous English poet and playwright. William Shakespeare was born on the 23d of April, 1564 in a small English city Stratford-upon-Avon, which thanks to him has become one of the most frequently visited places in England.

At the age of six he was sent to school, but had to leave it at the age of 13. At the age of eighteen, he married Anne Hathaway Ann was eight years older than her husband and the marriage wasn't a happy one

When Shakespeare was twenty-one, he went to London. Shakespeare became an actor and a member of a very successful acting company.

William Shakespeare is also considered to be the father of sonnets. All in all he wrote more than 37 plays, 154 sonnets, two long poems and a great number of other poems. The main genres of Shakespeare’s works were tragedies and comedies. Almost all his literary works have been translated into more than 30 languages.

His most famous works include such plays as “Romeo and Juliet”, “Hamlet”, “King Lear”, “Othello”, and many others. It’s remarkable that Shakespeare’s plays were staged in London in 1952, which means that he gained fame already in his 30s. Although a real acknowledgement of his works and high approval took place only in the 19th century. The era of Romanticism regarded Shakespeare as a genius and a lot of other writers got inspiration from his works.

In the 20th century many of his works were adapted and screened. Among them such plays as “Much ado about nothing”, “Measure for measure”, “Romeo and Juliet” and many others. His literature still remains highly claimed and appreciated. Thousands of theatres stage his plays throughout the world and lots of film companies shoot new versions of already known Shakespeare stories.

Shakespeare spent the last years of his life at Stratford, where he died, ironically, on the same date as his birthday, the 23d of April, 1616. He was buried in the church of Stratford. Some research shows that at the end of his life he was in poor health.

Answer the questions:

1. What was W. Shakespeare?
2. When was he born?
3. When did he become an actor?
4. What was the main genres of Shakespeare's works?
5. How many plays and tragedies did he write?
6. When did he die?
7. Where was William Shakespeare buried?

## Біяграфія Рыгора Барадуліна

Нарадзіўся 24 лютага 1935 года на хутары Верасоўка ва Ушацкім раёне Віцебскай вобласці. Пасля сярэдняй школы закончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Працаваў рэдактарам у розных пэрыядычных выданнях (сярод іх газета «Советская Белоруссия», часопісы «Бярозка», «Полымя»). З 1969 года працаваў у выдавецтве «Беларусь», з 1972 года – у выдавецтве «Мастацкая літаратура».

Першыя творы апублікаваў у 1954 годзе. Выдаў зборнікі паэзіі «Маладзік над стэпам» (1959), «Рунець, красавацць, наліваццa» (1961), «Нагбом» (1963), «Неруш» (1966), «Адам і Ева» (1968), «Лінія перамены дат» (1969), «Вяртанне ў першы снег» (1972), «Рум» (1974), «Свята пчалы» (1975), «Абсяг» (1978), «Вечалле» (1980), «Амплітуда смеласці» (1983) і іншыя. Цалкам плён працы Барадуліна складае каля 70 выдадзеных зборнікаў паэзіі (сярод якіх шмат зборнікаў сатыры й гумару, а таксама вершаў для дзяцей), крытычных артыкулаў, эсэ, перакладаў. Двойчы выходзілі ў свет зборы выбраных твораў паэта (у 1984 і з 1996 па 2002).

У 2006 годзе кандыдатура Барадуліна была сярод намінантаў на Нобэлеўскую прэмію ў галіне літаратуры (за зборнік вершаў «Ксты»). Паэтычны цыкл Барадуліна «Шчымлівыя рамансы» паклаў на музыку Мікалай Яцкоў.

У 1976 годзе за зборнік вершаў «Рум» і пераклад выбранай лірыкі Ф. Гарсія Лоркі «Блакітны звон Гранады» прысуджана Дзяржаўная прэмія БССР імя Янкі Купалы, а за «Баладу Брэсцкай крэпасці» – прэмія Ленінскага камсамола Беларусі. Рыгор Барадулін - апошні беларус, якому надалі званне Народнага паэта (1992). Атрымаў Ордэн Дружбы народаў, Ордэн Знак Пашаны, латыскі Ордэн Трох Зорак (1995), медаль Францыска Скарыны. Ганаровы доктар БДУ і ганаровы грамадзянін Ушацкага раёну.

Памёр 2 сакавіка 2014 года ў Мінску.

## Паэзія Рыгора Барадуліна

Паэзія Рыгора Барадуліна – паэзія любві да чысціні вясковага жыцця. Паэзія сына вёскі. У сваіх вершах ён раскрыў высакародныя маральна-этычныя прынцыпы вясковага жыцця. Жыццёвае крэда паэта-гуманіста, дзе былі зроблены першыя крокі па зямлі, дзе так доўга стаяла матчына хата, зробленая ў пасляваенныя гады жаночымі рукамі.

Другая тэма паэзіі Рыгора Барадуліна – пейзажная лірыка. Паэт, стараючыся раскрыць жывую душу прыроды, пастаянна параўноўвае яе з чалавечай душой, праводзіць паралель паміж жывым і нежывым. Прырода паўстае ў яго вершах

нейкай незвычайнай, загадкавай. У гэтых вершах праявілася майстэрства паэта малявацъ словам.

Тэма Радзімы і бацькаўшчыны – галоўнае ў творчасці Рыгора Барадуліна, яна праходзіць праз усе яго зборнікі. Рыгор Барадулін адным з першых у беларускай паэзіі адгукнуўся на трагедыю Чарнобыля. Вось гэта пытанне і робіцца цэнтрам роздуму ў "ЗАЖУРАНЫМ ТРЫПЦІХЕ". Гэта пытанне: "Ці не стане Чарнобыль бядой ракавой, апошняй для беларусаў?»

Асноўныя тэматычныя кіты творчасці Барадуліна – тэма маці, тэма Радзімы і тэма роднай мовы, філасоўскія асэнсаванні праблемы прызначэння чалавека, яго зямных спраў, роздумы пра вечны кругазварот жыцця.

Асабліва тонка вылучаецца інтымная лірыка Рыгора Барадуліна. Тэма кахання ў яго творчасці – гэта своеасаблівы вечны гімн, які ўзвышае чалавека і робіць яго высакародным.

Тэма Бога і веры – цэнтральная ў паэтычнай кнізе Рыгора Барадуліна "Евангелле ад Мамы" (1995).

*Пытанні*

1.Калі і дзе нарадзіўся Рыгор Барадулін?

2.Дзе вучыўся будучы паэт?

3.У якім годзе былі надрукаваны першыя творы Рыгора Барадуліна?

4.Якія зборнікі паэта вы ведаеце?

5.Да якіх тэм звяртаўся Рыгор Барадулін у сваёй творчасці?

6.Якія ўзнагароды меў паэт?

7.Дзе і калі скончылася жыццё Рыгора Барадуліна?

Дадатак 3

***Рыгор БАРАДУЛІН “Што ёсць каханне…?”***

Што ёсць каханне?
Бессаромнасць,
Ці сціпласць,
Што не ўздыме воч,
Ці разгаўленне,
Ці скаромнасць,
Ці ў зорках дзень,
Ці ў сонцы ноч?
Ці вечны грэх,
Ці пакаянне,
Ці сум цяжкі,
Ці весялосць?
Пакуль не стоміцца
Пытанне
Пытаць,
Датуль каханне
Ёсць!

***WILLIAM SHAKESPEARE  “Sonnet 116”***

Let me not to the marriage of true minds
Admit impediments. Love is not love
Which alters when it alteration finds,
Or bends with the remover to remove:

O no! it is an ever-fixed mark
That looks on tempests and is never shaken;
It is the star to every wand'ring bark,
Whose worth's unknown, although his height be taken.

Love's not Time's fool, though rosy lips and cheeks
Within his bending sickle's compass come;
Love alters not with his brief hours and weeks,
But bears it out even to the edge of doom:

If this be error and upon me proved,
I never writ, nor no man ever loved.

Дадатак 4

## СХЕМА АНАЛІЗУ ВЕРША

**1. Вызначыць тэму верша:**
а) пра што верш (кароткі змест)
б) каментарый сваіх адносін да дадзенага зместу
**2. Вызначыць ідэю верша (галоўную думку).**
**3. Паэтычныя сродкі:**
а) адухаўленне (прыпадабненне нежывога прадмета жывой істоце або чалавеку, адзін з відаў метафары)
б) алегорыя (іншасказанне, мастацкі прыём, калі абстрактная думка раскрываецца праз паводзіны жывёл, асаблівасці раслін, іншых прадметаў і рэчаў)
в) гіпербала (моцнае перавелічэнне )
г) гукапіс (падбор гукаў, якія перадаюць уражанне ад жыццёвай з’явы, ствараюць пэўную інтанацыю)
д) зваротак
ж) метафара ( мастацкі прыём, у аснове якога схаванае параўнанне)
з) параўнанне
і) паўторы
к) рэфрэн (слова, радок, некалькі радкоў, якія паўтараюцца пасля кожнай страфы або абзаца)
л) эпітэты (вобразнае мастацкае азначэнне)
**4. Эмацыянальная афарбоўка, інтанацыя** (гнеўная, іранічная, журботная, спакойная, лагодная, узнёслая, урачыстая, напружаная, звычайная, трагічная, заклапочаная, упэўненая, трывожная, урачыста-жалобная, сумная, балючая, жаласлівая, пакутлівая, шчымлівая ці якая іншая)

Дадатак 5

| | |
|---|---|
| адухаўленне | метафара |
| personification | metaphor |
| алегорыя | параўнанне |
| allegory | simile |
| гіпербала | паўторы |
| hyperbole | repetitions |
| гукапіс | рэфрэн |
| honetic devices | refrain |
| зваротак | эпітэты |
| address | epithets |

Дадатак 6

Каханне – найцяжэйшая з пакут.
Мая добраахвотная пакута.
Калі ж ты мне свой вынесеш прысуд?
Нібы падсудны, прагну я прысуду.

*Анатоль Грачанікаў “Актавы кахання”*

Ты пакліч мяне. Пазаві.
Там заблудзімся ў хмельных травах.
Пачынаецца ўсё зь любві,
Нават самая простая ява.

*Яўгенія Янішчыц “Ты пакліч мяне. Пазаві…”*

She walks in beauty, like the night
Of cloudless climes and starry skies;
And all that's best of dark and bright
Meet in her aspect and her eyes. (*Lord Byron)*

O my Luve's like a red, red rose
That's newly sprung in June;
O my Luve's like the melodie
That's sweetly play'd in tune.(*Robert Burns)*

Дадатак 7

